**Т.М.Гулева**, *старшы выкладчык*

# ФОРМЫ КАНТРОЛЮ ЗА САМАСТОЙНОЙ РАБОТАЙ ЗАМЕЖНЫХ МАГІСТРАНТАЎ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ РУСКАЙ МОВЫ

Вывучэнне замежнай мовы заўсёды патрабуе пэўнай самастойнасці. Таму праблеме арганізацыі самастойнай работы і кантролю за ёй у методыцы выкладання рускай мовы для замежных грамадзян адводзіцца важнае месца.

Спецыфіка пазааўдыторнай работы ў групе кітайскіх магістрантаў першага года навучання заключаецца ў тым, што самастойна павінны працаваць навучэнцы, моўныя навыкі і ўменні якіх знаходзяцца ў стадыі фарміравання. Трэба ўлічваць і тое, што руская і кітайская мовы — вельмі далёкія па сваіх лексічных, граматычных, фанетычных і іншых асаблівасцях, і таму самастойнай рабоце з рускай мовай трэба адводзіць шмат часу. Выкладчык на першым курсе павінен далучыць навучэнцаў да актыўнай самастойнай дзейнасці, пазнаёміць іх з прыёмамі набыцця і перапрацоўкі неабходнай моўнай інфармацыі.

Выкладчык тлумачыць мэты і задачы кожнага тыпу самастойнай работы, разам з магістрантамі аналізуе матэрыял, дапамагае вызначыць аптымальныя накірункі і шляхі выканання дадзенага канкрэтнага задання.

Роля выкладчыка як арганізатара самастойнай работы мяняецца ў залежнасці ад этапу навучання. Паступова разам з ростам уменняў і навыкаў магістрантаў расце і ўзровень іх самастойнасці. Калі спачатку выкладчык непасрэдна кіруе іх самастойнай работай, то паступова гэтае кіраванне пачынае набываць больш апасродкаваны характар.

Адным з відаў самастойнай работы на першым курсе з'яўляюцца арганізацыя і правядзенне дамашняга чытання.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Выкладчык падбірае навучэнцам тэксты ў залежнасці ад іх моўных магчымасцей па прынцыпе “ад простага да складанага”. Спачатку даюцца тэксты больш лёгкія і меншыя па аб’ёме, затым — больш цяжкія. Для самастойнага дамашняга чытання могуць быць прапанаваны тэксты, звязаныя з культурай, мастацтвам, адукацыяй у Беларусі і інш. Самастойнай рабоце над тэкстамі для чытання папярэднічаюць, як правіла, вывучэнне і замацаванне новай лексікі па тэме, запіс яе ў індывідуальны слоўнік, выкананне на яе аснове практыкаванняў розных тыпаў.

На пачатковым этапе навучання, працуючы над першымі тэкстамі, выкладчык рэкамендуе асноўныя кірункі дзеянняў, іх паслядоўнасць. Напрыклад, сустрэўшы незнаёмае рускае слова, навучэнцу не варта адразу ж звяртацца да слоўніка. Трэба спачатку паспрабаваць здагадацца аб значэнні слова, абапіраючыся на кантэкст.

На другім курсе, кантралюючы самастойную работу па дамашнім чытанні ў час аўдыторных заняткаў, выкладчык задае навучэнцам пытанні па змесце твора, просіць пераказаць урыўкі з тэксту, скласці план (назыўны, пытальны, разгорнуты), вызначыць ідэю твора, падумаць над сваімі адносінамі да прачытанага. Творчы від самастойнай работы прадугледжвае навучанне прыёмам выказвання ўласных думак пры рабоце над самастойным падборам матэрыялу з іншых крыніц па пэўнай тэматыцы (напрыклад, матэрыялу пра кітайскіх вучоных, музыкантаў, мастакоў пасля вывучэння тэкстаў пра рускіх і беларускіх дзеячаў культуры). Пры кантролі за дамашнім чытаннем выкладчык абавязкова павінен звяртаць увагу на ўдасканаленне ў мове навучэнцаў арфаэпічных, акцэнтуальных, граматычных і іншых навыкаў.

Яшчэ адзін від самастойнай работы, праўда, больш складаны — падрыхтоўка маналагічнага выказвання на зададзеную тэму. На першым курсе гэта такія тэмы, як “Я і мая

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

сям'я", "Мой родны горад", "Мая родная краіна", "Мая лепшая сяброўка", на другім курсе — "Мая спецыяльнасць", "Знакаміты кітайскі вучоны (кампазітар, харэограф, мастак)", "Мая навуковая работа" і інш. Гэта могуць быць і разнастайныя па сваёй тэматыцы апавяданні-мініяцюры, апісанні прыроды, чалавека, разважанні на розныя тэмы. Замежныя магістранты прымаюць удзел у канцэртах, вечарынах, экскурсіях, а потым самастойна рыхтуюць маналагічныя выказванні (вусныя і пісьмовыя) з апісаннем гэтых падзей. Падрыхтоўка да такога віду самастойнай работы патрабуе вывучэння новай лексікі, складання планаў, вусных і пісьмовых адказаў на пытанні, перакладаў з кітайскай мовы на рускую. Частка лексікі па тэме можа быць выкарыстана ў працэсе вывучэння граматыкі.

Самастойная работа замежных магістрантаў мае вялікае значэнне ў навучальным працэсе. Яна дае станоўчыя вынікі пры ўмове выканання шэрага патрабаванняў:

1) сфарміраванасці навыкаў самастойнай работы;

2) сувязі самастойнай работы са зместам аўдыторных заняткаў (кожнае новае заданне спачатку адпрацоўваецца ў аўдыторыі, а толькі потым прапаноўваецца для самастойнай работы);

3) разнастайнасці заняткаў па форме і змесце (практыкаванні па развіцці як вуснай, так і пісьмовай мовы, адпрацоўка лексіка-граматычнага матэрыялу), выкарыстанні ў самастойнай рабоце з энцыклапедыямі, слоўнікамі, даведнікамі, мастацкай літаратурай, тэхнічнымі сродкамі навучання набытых ведаў, уменняў і навыкаў.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ